# Русь • Літва • Арда

## ЎПОМНІКАХ НУМІЗМАТЫКІ І СФРАГІСТЫКІ

*Том 14*

*Спецвыпуск «Заходняя Русь і Арда»*



Варшава • 2024

*Выданне выходзіць пры падтрымцы фонду*
*"Sven Svenssons stiftelse för numismatik" (Швецыя)*




*Рэдкалегія:*
Дз.У. Гулецкі
В.В. Зайцаў
Г.А. Цітоў

*Рэцэнзенты:*
Барыс Пашкевіч, доктар навук,
прафесар Інстытута археалогіі Вроцлаўскага ўніверсітэта
Раман Крыцук, навуковы супрацоўнік Кабінета манет і медалёў
(Нацыянальны музей у Варшаве)

**Русь, Літва, Арда ў помніках нумізматыкі і сфрагістыкі.** Том 14. Спецвыпуск «Заходняя Русь і Арда» – Варшава : ЕГУ, 2024. – 200 с., мал.

Чатырнаццаты том серыі «Русь, Літва, Арда ў помніках нумізматыкі і сфрагістыкі» – спецыяльны выпуск, засяроджаны на гістарычным кантэксце Заходняй Русі ў перыяд Сярэднявечча. У выпуск увайшлі матэрыялы па валынскай, тураўскай, чарнігаўскай, полацкай сфрагістыцы XI–XIII стст., а таксама па нумізматыцы земляў былой Кіеўскай Русі па мангольскім заборы, што пазней увайшлі ў склад Вялікага княства Літоўскага, і тых, што знаходзіліся пад безпасярэднім уплывам Джучыдаў.

Выпуск складзены па-беларуску і па-украінску і прызначаны для гісторыкаў, археолагаў, нумізматаў і сфрагістаў, музейных работнікаў і калекцыянераў, а таксама для шырокага кола чытачоў, што цікавяцца гістарычнымі помнікамі перыяду Сярэднявечча.

© Калектыў аўтараў, 2024
© Еўрапейскі гуманітарны ўніверсітэт, 2024



**Памяці**
**Валерыя Нечытайлы**
**(1963–2020),**
украінскага даследчыка і эрудыта,
кандыдата гістарычных навук

Еўрапейскі гуманітарны
ўніверсітэт

# ЗМЕСТ

**Прадмова** .......................................................................6
***Foreword***

**І.А. Жукаў.** Віслыя пячаткі князя Яраполка (Пятра) Ізяславіча 1069–1086 гадоў.......................................................8
***Igor A. Zhukov.*** *Seals of the Prince Yaropolk-Peter Izyaslavich (1069–1086)*

**Дз.У. Гулецкі, А.У. Якаўлеў, А.К. Богуш.** Пячаткі і пломбы XI ст. з выявай св. пакутніка Фёдара ...................................... 24
***Dzmitry Huletski, Andrey Yakovlev, Anatol Bohuš.*** *Large and small seals of the 11th century with the image of the saint martyr Theodore of Amasea*

**Ю.Г. Цігунцаў.** Свінцовыя пячаткі XI–XII стст. з паўночна-заходняй часткі Чарнігаўскай зямлі (па зборах у Бранскай вобласці). Частка 3: пячаткі і пломбы з выявамі святых розных тыпаў і памераў ................................................... 43
***Yury G. Tiguntsev.*** *Lead seals of the 11th–12th centuries from the north-western part of the Chernihiv Land (according to findings in the Bryansk region). Part 3: Large and small seals of various types and sizes with the images of saints*

**А.К. Богуш.** Старажытнарускія свінцовыя пломбы XI–XIII стст. з тэрыторыі Друцкага княства ..................................... 71
***Anatol Bohuš.*** *Ancient Rus' lead seals of the 11th–13th centuries from the territory of Druck Land*

**А.А. Грамыка.** Да пытання аб пачатку абарачэння пражскіх грошаў на тэрыторыі Беларусі. ............................................172
***Aliaksandr Hramyka.*** *A note on the beginning of the Prague groats circulation on the territory of Belarus*

**О.О. Шевчук.** Комплекс джучидських дангів 1370-х років із Зіньківського району Полтавської області .....................186
***Oleksandr Shevchuk.*** *A hoard of Jochid dangs of the 1370s from the Zinkiv district of the Poltava region*

**Ю.В. Зайончковський.** Невеликий гаманець дангів з-під міста Богодухова Харківської області. ..................................194
***Yuriy Zayonchkovskiy.*** *A small purse of dangs from the town of Bogodukhov, Kharkiv region*

# СКАРАЧЭННІ

| | | |
|---|---|---|
| **БСЭ** | — | Вялікая Савецкая Энцыклапедыя (Большая Советская Энциклопедия) |
| **ВНК** | — | Усерасійская нумізматычная канферэнцыя (Всероссийская нумизматическая конференция) |
| **ГАИМК** | — | Дзяржаўная акадэмія гісторыі матэрыяльнай культуры (Государственная Академия истории материальной культуры) |
| **ГИМ** | — | Дзяржаўны гістарычны музей (Государственный исторический музей) |
| **г. х., гг. х.** | — | год, гады хіджры |
| **ЗАНО** | — | Запіскі археалагічна-нумізматычнага таварыства (Записки археологическо-нумизматического общества) |
| **ИАППЗ** | — | Гісторыя і археалогія Полацка і Полацкай зямлі (История и археология Полоцка и Полоцкой земли) |
| **ИИМК РАН** | — | Інстытут гісторыі матэрыяльнай культуры Расійскай Акадэміі навук (Институт истории материальной культуры РАН) |
| **КСИА** | — | Кароткія паведамленні Інстытута археалогіі (Краткие сообщения Института археологии) |
| **МНК** | — | Міжнародная нумізматычная канферэнцыя (Международная нумизматическая конференция) |
| **МНК Ст. Ладога** | — | зборнік тэзісаў дакладаў на Міжнароднай нумізматычнай канферэнцыі ў Старой Ладазе (сборник тезисов докладов на Международной нумизматической конференции в Старой Ладоге) |
| **НС ГИМ** | — | Нумізматычны зборнік Дзяржаўнага гістарычнага музея (Нумизматический сборник ГИМ) |
| **НЧ ГИМ** | — | Нумізматычныя чытанні Дзяржаўнага гістарычнага музея (Нумизматические чтения ГИМ) |
| **НиЭ** | — | Нумізматыка і эпіграфіка (Нумизматика и эпиграфика) |
| **НФ** | — | Нумізматыка і фалерыстыка (Нумизматика и фалеристика) |
| **ПВЛ** | — | «Аповесць мінулых гадоў» («Повесть временных лет») |
| **ПСРЛ** | — | Поўны збор рускіх летапісаў (Полное собрание русских летописей) |
| **РЛО** | — | Русь, Літва, Арда ў помніках нумізматыкі і сфрагістыкі (Русь, Литва, Орда в памятниках нумизматики и сфрагистики) |
| **САИ** | — | Збор археалагічных крыніц (Свод археологических источников) |
| **СНВЕ** | — | Сярэднявечная нумізматыка Усходняй Еўропы (Средневековая нумизматика Восточной Европы) |
| **экз.** | — | экзэмпляр (-ы) |

# Прадмова

Паважаны чытач,

Вы трымаеце ў руках чарговы, чатырнаццаты выпуск серыі «Русь, Літва, Арда». Гэта другі выпуск, які выходзіць пад эгідай Еўрапейскага гуманітарнага ўніверсітэта (Літва). У трэці раз выданне было падтрымана фондам "Sven Svenssons stiftelse för numismatik" (Швецыя). Том мае відавочны акцэнт на тэматыцы гісторыі Заходняй Русі, а таксама заходніх тэрыторый Улуса Джучы перыяду яго заняпаду.

У якасці эксперыменту, у тым ліку для падтрымкі нацыянальных нумізматычных школ Беларусі і Украіны, гэты спецвыпуск падрыхтаваны на дзвюх мовах – беларускай і ўкраінскай. У той час, як падзеі апошніх гадоў паставілі пад сумнеў існаванне шэрагу гістарычных выданняў Усходняй Еўропы ў ранейшай парадыгме, а рэдакцыйная палітыка іншых абумоўленая палітычна, мы імкнемся падтрымліваць і публікаваць аўтараў, якія кіруюцца шчырай даследчыцкай цікавасцю да эпохі Сярэднявечча.

У апошняе дзесяцігоддзе нумізматыка і сфрагістыка ўсё больш набываюць рысы «дакладных навук», ужываючы прылады скрупулёзнай графічнай рэканструкцыі штэмпеляў, аднаўляючы тэхналагічныя сувязі, вывучаючы метралогію артэфактаў, якія становяцца даступнымі для даследавання ва ўсё большых колькасцях. Штогод выдаючы выпускі зборніка «Русь, Літва, Арда», мы імкнемся захаваць для навукі як мага больш «свежых» дадзеных аб знаходках, хоць варта прызнаць, што намаганняў нашых і нашых аўтараў стае на публікацыю толькі меншай часткі артэфактаў, якія падымаюцца аматарамі пошуку.

Першыя чатыры артыкулы зборніка прысвечаныя матэрыялам па старажытнарускай сфрагістыцы. У параўнанні з манетамі вывучэнне сфрагістычных помнікаў сярэднявечнай гісторыі патрабуе прыкметна большых намаганняў ад іх даследчыкаў, што абумоўлівае павярхоўны пакуль узровень нашага разумення функцыянавання свінцовых пломбаў і пячатак у звароце, як сістэмы.

Зборнік адкрывае артыкул І.А. Жукава, які падсумоўвае веды пра пячаткі Яраполка Ізяславіча (1043/47–1086) – князя Валынскага, Вышгародскага і Тураўскага. Ад шматгадовай дзейнасці князя засталіся выдатныя сфрагістычныя помнікі. Аўтар артыкула крытычна аналізуе атрыбуцыі папярэднікаў, а таксама ўпершыню адносіць яшчэ колькі тыпаў пячатак і пломбаў да разгляданага эмітэнта.

Дз.У. Гулецкім, А.У. Якаўлевым і А.К. Богушам для паштэмпельнага даследавання быў абраны тып са св. Фёдарам-пакутнікам. У зборы старажытнарускіх актавых пячатак В.Л. Янін удакладняе меркаванне М.П. Ліхачова, які ўпершыню датаваў яго, у першым набліжэнні, XI стагоддзем. У пачатку 2010-х з'явілася гіпотэза аб прыналежнасці пячатак з выявай св. Фёдара-пакутніка Усяславу Брачыславічу Полацкаму (1044–1101). У другой палове дзесяцігоддзя, намаганнямі шэрагу беларускіх, расійскіх і ўкраінскіх аўтараў, былі апублікаваныя шматлікія, невядомыя раней экзэмпляры дадзенага сфрагістычнага тыпу, перш за ўсё, пломбы. У двух артыкулах адным з аўтараў працы была ўжо раней закранутая праблематыка атрыбуцыі гэтага тыпу і сфармуляваныя дадатковыя довады на карысць аднясен-

ня яго Усяславу. У гэтай жа працы сабраны ўсе вядомыя штэмпельныя разнавіднасці апісванага сфрагістычнага тыпу, выяўленыя тэхналагічныя сувязі паміж імі, выкананая іх графічная рэканструкцыя.

У дзвюх наступных артыкулах, адпаведна, Ю.Г. Цігунцавым і А.К. Богушам, працягваецца публікацыя шматлікіх рэгіянальных знаходак старажытнарускіх пломбаў і пячатак. Расійскі аўтар публікуе матэрыял з гістарычнай паўночна-заходняй часткі Чарнігаўскай зямлі – пячаткі і пломбы з выявамі святых на абодвух баках, альбо ў спалучэнні з рускай легендай, розных тыпаў і памераў.

У артыкуле А.К. Богуша прыводзяцца звесткі аб апошніх зборах з 799 прадметаў малой сфрагістыкі, знойдзеных на пасадзе старажытнага горада Друцка. Такая вялікая колькасць знаходак у наваколлі Друцкага гарадзішча абумоўленая адсутнасцю забудоў на яго тэрыторыі і, адпаведна, даступнасцю пошуку такіх артэфактаў. Безумоўна, пры належным падыходзе, многія старажытнарускія гарады яшчэ могуць прадставіць даследнікам падобную колькасць матэрыялу для вывучэння.

Наступныя артыкулы пераносяць нас у канец XIV – пачатак XV стст. Яны прысвечаныя нумізматыцы. А.А. Грамыка даследуе гіпотэзы сваіх папярэднікаў адносна звароту пражскага гроша на тэрыторыі Беларусі. Даследчык прыходзіць да высновы, што некрытычнае стаўленне да пісьмовых крыніц, а таксама памылковая атрыбуцыя манет Смаленскага скарбу 1889 года і прадметаў з раскопак у Ваўкавыску прывялі да ўкаранення ў беларускай нумізматыцы хібных уяўленняў аб раннім паступленні сюды чэшскай манеты. Згодна з праверанымі дадзенымі, толькі ў пачатку XV стагоддзя хаджэнне чэшскіх манет ахоплівае ўсю тэрыторыю сучаснай Беларусі.

Завяршаюць зборнік працы ўкраінскіх аўтараў, якія публікуюць і аналізуюць невялікія скарбы заходнеджучыдскай манеты. Так, мэтай паведамлення А.А. Шаўчука ёсць увядзенне ў навуковы зварот невялікага комплексу з 28 сярэбраных дангаў, знойдзенага ў 2019 годзе.

Праца Ю.В. Заянчкоўскага прысвечаная публікацыі комплексу з чатырох сярэбраных джучыдскіх дангаў, знойдзенага вясной 2021 года на ўсходзе Украіны, недалёка ад горада Багадухава. Датаваць тэзаўрацыю публікаванага комплексу можна перыядам праўлення хана Пулада. Друкуецца і новы тып дангаў хана Пулада без абазначэння месца выпуску і з скажонай датай выбіцца на рэверсе.

Зборнік прысвечаны памяці ўкраінскага даследчыка і эрудыта Валерыя Нечытайлы (1963–2020). Будучы выхадцам з калекцыянераў і энтузіястам-непрафесіяналам, ён, незадоўга да заўчаснай смерці, змог рэалізаваць сваю мару, абараніўшы дысертацыю і атрымаўшы званне кандыдата гістарычных навук. Менавіта В. Нечытайлу належыць шэраг атрыбуцый сфрагістычных помнікаў, на якія спасылаюцца аўтары першых артыкулаў нашага выдання. Гэтак жа захопленых эпохай Сярэдніх вякоў даследнікаў, роўна як і дасведчаных прафесійных навукоўцаў, мы, як звычайна, запрашаем да супрацоўніцтва ў рамках будучых выпускаў серыі «Русь, Літва, Арда».

*Рэдкалегія*

Вось што наконт іх атрыбуцыі пішуць мэтры старажытнарускай сфрагістыкі: *«Абедзве пячаткі варыянту № 316 паходзяць з кіеўскіх знаходак. Па сваім памеры і стылістычных асаблівасцях яны імкнуцца да булаў сярэдзіны трэцяй чвэрці XI ст., г.зн. да часу, калі выява Маці Божай яшчэ не мела характару эмблемы, якая азначае прыналежнасць да царквы. У гэты перыяд магчымымі ўладальнікамі названых пячатак могуць быць князі Ізяслаў-Дзмітрый Яраславіч і яго сын Яраполк-Пятро. Лёс абодвух быў досыць пакручасты, і не выключана, што разгляданыя варыянты бул маюць дачыненне да перыяду іх замежных бадзянняў, калі пошук кантактаў з Руссю быў істотнай часткай іх быцця»* (*Янин В.Л., Гайдуков П.Г.*, 1998. С. 59).

### Тып 3а



**Мал. 11**

**Перад** Паясная выява св. Пятра з крыжом у левай руцэ. Злева калончаты надпіс: ПЕ / ТР. Вакол кропкавы абадок.

**Адварот** Паясная выява свв. Барыса і Глеба. Злева калончаты надпіс: Б / РН / С, справа Г / Л. Вакол кропкавы абадок.

Дыяметр 30 мм. Месца знаходкі: Гродзенская вобл., Карэліцкі р-н, да 2012 г. Захоўваецца ў прыватнай калекцыі, Масква (*Нечитайло В.В.*, 2013. С. 7–8, № 11) (**Мал. 11**). Зарэгістраваны 1 экз. пячатак гэтай пары матрыц.

**8**



Цікавая дэталь на ***перадзе*** – маленькі круглы шчыт пад крыжом справа.
*Гулецкий Д.В.*, 2018. Фотатабліца 3, 1, 2; *Гулецкий Д.В., Ярошевский Н.А.*, 2018. С. 92, Фотатабліца 1, 8; *Гулецкий Д.В., Дорошкевич Н.А.*, 2018-2. С. 203, № 35В.

**9**



На ***адвароце*** княжацкі знак «параднай» формы, характэрны для XI ст. У яго верхняй частцы шасціканечны крыж на гарызантальнай падставе.
*Алфьоров О.*, 2011. С. 219, № 16; *Гулецкий Д.В., Дорошкевич Н.А.*, 2018-2. С. 208, № 37; *Тигунцев Ю.Г., Гулецкий Д.В.*, 2017. С. 124. № 15.1; *Gaydukov P.*, 2019. P. 201. Fig. 2, 19, 20; *Volkhonsky V., Singh V.*, 2019. Pl. 2, II-8, II-9; *Богуш А.К.*, 2020. С. 135. Фотатабліца 5Е-3.

**10а**



*Гулецкий Д.В.*, 2016. С. 12, № 4; *Тигунцев Ю.Г., Гулецкий Д.В.*, 2017. С. 120, № 12.1-3; *Гулецкий Д.В.*, 2018. Фотатабліца 3, 16; *Гулецкий Д.В., Дорошкевич Н.А.*, 2018-2. С. 205, № 35Е; *Gaydukov P.*, 2019. P. 200. Fig. 2, 2; *Volkhonsky V., Singh V.*, 2019. Pl. 3, II-27; *Калбеко Л.Г.*, 2020. С. 166. Мал. 2-1; *Богуш А.К.*, 2022. Фотатабліца 2Б, 2.

**10в**



Стылістыка і графіка малюнкаў вельмі блізкія № 10а, супадаюць у маштабах і абрысах, але адрозніваюцца ў дробных дэталях: верагодна, адбывалася праўка штэмпеляў абодвух бакоў.
*Гулецкий Д.В., Дорошкевич Н.А.*, 2018. С. 127, № 2.

святога Глеба, што пацвярджаецца калончатымі літарамі па баках. Іканаграфія выявы правага боку гэтай пячаткі цалкам паўтарае іканаграфію адваротнага боку папярэдняй пячаткі. Узаемасувязь паміж выявамі бакоў відавочная. Але падабенства гэтых выяў не можа быць скарыстана як прамы аргумент на карысць часавых сувязяў гэтых сфрагісаў, бо на працягу доўгага часу выконваўся іканаграфічны канон. Аўтарам гэтай публікацыі першапачаткова гэта пячатка асацыявалася са старэйшым сынам князя Святаслава-Мікалая Яраславіча – Глебам Святаславічам, князем Тмутараканскім (1064, 1067–1068), верагодна, да часу яго княжання ў Ноўгарадзе (1069–1078). Аргументамі да аднясення гэтай неардынарнай пячаткі да вышэйпамянутага князя былі яе памер, а таксама падабенства іканаграфіі выяў св. Мікалая Мірлікійскага і графікай кірылічных калончатых літар па баках з пячаткай князя Святаслава Яраславіча, князя Чарнігаўскага (1054–1073), Кіеўскага (1073–1076) (*Янин В.Л., Гайдуков П.Г.,* 1998. С. 113–114, 229. Рис. 9а). Аднак аргумент, звязаны з велічынёй пячаткі № 38, не можа быць ужыты з-за таго, што памеры нашай пячаткі атрымаліся з-за залішняга высілка пры яе адбітку. Аб гэтым наглядна сведчаць разрывы крапежных каналаў. Таксама матрыцы булатырыя, які выкарыстоўваўся пры адбітку гэтай пячаткі, гравіраваныя, верагодна, у пазнейшы час з-за адсутнасці абмежавальных абадкоў па вонкавых контурах выяў бакоў матрыц. Таму аўтар схіляецца да меркавання даследчыка-сфрагіста І. Жукава, што гэтая була ўсё ж можа належаць полацкаму князю Расціславу (Мікалаю?) Глебавічу (1151–1158), старэйшаму сыну Глеба Усяславіча.

**38. Паясная выява св. Глеба, злева выявы калончатыя літары «Г/Л/Ѣ (люстрана)», справа «Б/О» / Паясная выява св. Мікалая Мірлікійскага, справа выявы калончатыя літары «О/а/Г», злева выявы «N/Н/К/У/Л/а»**

| № | Перад | Адварот | Вага, г; дыяметр/памер, мм; размяшчэнне бакоў, знешнія асаблівасці | Населены пункт, раён знаходкі |
|---|---|---|---|---|
| 38 |  |  | 17.84; 33; ↑↓ | Старадубскі р-н, с. Ніжняе |

Наступныя пячаткі «зайшлі» на паўночны захад Чарнігаўскай зямлі выкананымі на загатоўках зменшанага памеру. Пячатка на прамавугольнай загатоўцы зафіксавана на землях сучаснай Чарнігаўскай вобласці Украіны (*Гулецкий Д.В., Ярошевский Н.А.,* 2018., С. 111. Фототаблица 6. Продолжение, № 27). Пячатка на большай па велічыні загатоўцы меркавана аднесеная даследчыкам І. Жукавым да Барыса Рагвалодавіча, князя Друцкага да 1195 года (*Жуков И.А.,* 2016. С. 39, № 55). Аднак даследчыкам таксама прапанаваны другі прэтэндэнт на гэты тып

**Табліца 3.** Наваколлі в. Друцк, пасад старажытнага горада, збор 3, Талачынскі раён, Віцебская вобласць
**Табліца 3А.** Пломбы з выявай святых

| № п/п | Тэхнічныя характарыстыкі | | | | Сувосе-васць ЛС/АС | Меркаваны эмітэнт | Гады кіравання | Нумар у каталогу |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | Фор-ма | Тып заг-кі | Геаметр. памеры, мм | Вага, г | | | | |
| 1 | Кр | ЛО | 12.4x12.9 | 1.85 | ↑↑ | Усяслаў Брачыславіч | 1044–1101 | 35F |
| 2 | Кр | Пл | 13.7x15.9 | 2.99 | ↑↑ | Усяслаў Брачыславіч | 1044–1101 | 38 |
| 3 | Кр | Пл | 12.0x15.4 | 2.57 | ↑↑ | Усяслаў Брачыславіч | 1044–1101 | 38 |
| 4 | Пр | Пл | 11.2x11.6 | 1.34 | ↑↑ | Усяслаў Брачыславіч | 1044–1101 | 38 |
| 5 | Кр | Пл | 14.7x14.6 | 1.65 | ↑↓ | Усяслаў Брачыславіч | 1044–1101 | 38 |
| 6 | Кр | Пл | 12.6x13.4 | 2.23 | ↑↑ | Усяслаў Брачыславіч | 1044–1101 | 38 |
| 7 | Кр | ЛО | 12.1x13.0 | 2.58 | ↑↑ | Барыс Усяславіч | 1101–1128 | 40А |
| 8 | Кр | ЛО | 10.0x11.5 | 2.11 | ↑↑ | Барыс Усяславіч | 1101–1128 | 40А |
| 9 | Кр | ЛО | 11.5x12.4 | 1.97 | | Барыс Усяславіч | 1101–1128 | 42 |
| 10 | Кр | Пл | 12.3x13.2 | 1.70 | ↑↑ | Барыс Усяславіч | 1101–1128 | 48 |
| 11 | Пр | Пл | 8.6x11.0 | 0.91 | | Барыс Усяславіч | 1101–1128 | 49 |
| 12 | Пр | Пл | 11.0x14.2 | 3.14 | | Барыс Усяславіч | 1101–1128 | 51 |
| 13 | Кр | Пл | 11.1x11.2 | 2.00 | ↑↓ | Васілька Святаславіч | 1132–1146 | 52А |
| 14 | Пр | Пл | 8.6x10.3 | 1.04 | ↑↓ | Васілька Святаславіч | 1132–1146 | 52А |
| 15 | Кр | Пл | 10.0x14.3 | 1.09 | ↑↑ | Васілька Святаславіч | 1132–1146 | 52В |
| 16 | Кр | Пл | 10.6x13.5 | 1.51 | ↑↑ | Васілька Святаславіч | 1132–1146 | 52В |
| 17 | Кр | Пл | 8.1x10.5 | 0.89 | ↑↑ | Расціслаў Глебавіч | 1151–1158 | 55 |
| 18 | Кр | Пл | 12.8x15.3 | 3.34 | ↑↑ | Расціслаў Глебавіч | 1151–1158 | 55 |
| 19 | Кр | Пл | 10.3x12.0 | 1.69 | ↑↓ | Расціслаў Глебавіч | 1151–1158 | 56 |
| 20 | Пр | Пл | 9.9x9.0 | 0.76 | ↑↑ | Расціслаў Глебавіч | 1151–1158 | 57 |
| 21 | Кр | Пл | 10.3x9.5 | 1.21 | ↑↑ | Расціслаў Глебавіч | 1151–1158 | 57 |
| 22 | Кр | Пл | 9.8x9.8 | 0.91 | ↑↑ | Расціслаў Глебавіч | 1151–1158 | 57 |
| 23 | Пр | Пл | 13.1x12.4 | 2.53 | ↑↑ | Расціслаў Глебавіч | 1151–1158 | 57 |
| 24 | Пр | Пл | 12.7x13.9 | 2.25 | ↑↑ | Расціслаў Глебавіч | 1151–1158 | 57 |
| 25 | Пр | Пл | 10.6x13.3 | 1.76 | ↑↑ | Расціслаў Глебавіч | 1151–1158 | 57 |
| 26 | Пр | Пл | 7.1x7.6 | 0.67 | ↑↑ | Расціслаў Глебавіч | 1151–1158 | 57 |
| **Неатрыбутаваныя** | | | | | | | | |
| 27 | Пр | Пл | 12.8x12.2 | 2.36 | ↑↑ | | | |
| 28 | Пр | Пл | 9.2x10.2 | 1.13 | | | | |

**Фотатабліца 3А**



**3А-1.** 1.85 г



**3А-2.** 2.99 г

**Табліца 7.** Апублікаваныя знаходкі старажытнарускіх свінцовых пломбаў у Друцкім княстве

| № п/п | Месцы знаходак | Коль-ць | Літаратурныя крыніцы |
|---|---|---|---|
| 1 | Наваколле г. Талачына | 20 | *Богуш А.К.*, 2020 |
| 2 | Талачынскі р-н | 1 | *Жуков И.А.*, 2016-2. С. 332. Мал. 30 |
| 3 | Талачынскі р-н | 62 | *Гулецкий Д.В., Дорошкевич Н.А.*, 2018-1 |
| 4 | в. Друцк, Талачынскі р-н | 1 | *Алексеев Л.В.*, 1966. С. 105. Мал. 18:2 |
| 5 | в. Друцк, Талачынскі р-н | 8 | *Левко О.Н., Войтехович А.В., Кенько П.М., 2011. С. 12. Мал. 4: 4; С. 135,* мал. *13: 1–7* |
| 6 | в. Друцк, Талачынскі р-н | 10 | *Друцк*, 2014. Мал. 12.22, Фота 9:5, 6 |
| 7 | в. Друцк, Талачынскі р-н | 1 | *Жуков И.А.*, 2016-1 |
| 8 | в. Друцк, Талачынскі р-н | 1 | *Жуков И.А.*, 2016-2. С. 327. Мал. 7 |
| 9 | в. Друцк, Талачынскі р-н | 74 | *Гулецкий Д.В.*, 2016 |
| 10 | в. Друцк, Талачынскі р-н | 81 | *Гулецкий Д.В.*, 2017 |
| 11 | в. Друцк, Талачынскі р-н | 5 | *Гулецкий Д.В., Дорошкевич Н.А.*, 2018-1 |
| 12 | в. Друцк, Талачынскі р-н | 16 | *Богуш А.К.*, 2020 |
| 13 | р. Друць, Талачынскі р-н | 28 | *Богуш А.К.*, 2020 |
| 14 | в. Друцк, Талачынскі р-н | 298 | *Гулецкі Дз.У., Богуш А.К., Кабак А.У.*, 2022 |
| 15 | в. Друцк, Талачынскі р-н | 226 | *Богуш А.К.*, 2022-1 |
| 16 | в. Друцк, Талачынскі р-н | 49 | *Богуш А.К.*, 2022-1 |
| 17 | в. Друцк, Талачынскі р-н | 2 | *Богуш А.К.*, 2022-1 |
| 18 | в. Друцк, Талачынскі р-н | 146 | Дадзены артыкул |
| 19 | в. Друцк, Талачынскі р-н | 214 | Дадзены артыкул |
| 20 | в. Друцк, Талачынскі р-н | 66 | Дадзены артыкул |
| 21 | в. Друцк, Талачынскі р-н | 300 | Дадзены артыкул |
| 22 | в. Друцк, Талачынскі р-н | 59 | Дадзены артыкул |
| 23 | в. Коханава, Талачынскі р-н | 14 | Дадзены артыкул |
| 24 | р. Крывая, в. Абольцы, Талачынскі р-н | 10 | *Богуш А.К.*, 2020 |
| 25 | в. Сурнаўка, Талачынскі р-н | 3 | *Богуш А.К.*, 2020 |
| 26 | в. Коханава, Талачынскі р-н | 7 | *Богуш А.К.*, 2020 |
| 27 | в. Замошша, Талачынскі р-н | 5 | *Гулецкий Д.В., Дорошкевич Н.А.*, 2018-1 |
| 28 | в. Перавалочная, Талачынскі р-н | 8 | *Богуш А.К.*, 2022-1 |
| | **Усяго** | **1715** | |

Як бачна, на тэрыторыі былога Друцкага княства выяўлена і зафіксавана ў публікацыях 1715 старажытнарускіх свінцовых пломбаў. Гэта вялікая колькасць параўнальна з колькасцю такіх знаходак у польскім Чэрмне (г. Чэрвень Уладзімір-Валынскага княства) (*Florkiewicz I., Jusupovic A., Musin A.*, 2020), у Ноўгарадзе, Гарадцы на Волзе і ў Смаленску (*Gaydukov P.*, 2019). Гэта больш за палову з усіх выяўленых на тэрыторыі Беларусі трох тысяч пломбаў (*Богуш А.К.*, 2022-3). Відавочна, такая вялікая колькасць знаходак у наваколлі Друцкага гарадзішча абумоўлена адсутнасцю забудоў на яго тэрыторыі і, адпаведна, даступнасцю пошуку такіх артэфактаў. З падобнай сітуацыяй сутыкнуліся даследнікі пры абследаванні старажытнарускага гарадзішча ў польскім Чэрмне.

Прыведзеная ў **Табліцы 7** літаратура дазваляе правесці аналіз знойдзеных пломбаў на прадмет прыналежнасці іх пэўным эмітэнтам. Атрыманыя дадзеныя прыведзены ў **Табліцы 8**.

ў Ваўкавыску (час і месца знаходак аўтар не ўдакладняе) (*Зверуго Я.Г.*, 1975. С. 82). Праўдападабна, інфармацыя пра знаходку гроша была прадубляваная з-за блытаніны з яго атрыбуцыяй у розных крыніцах і ў сапраўднасці гаворка ідзе пра адну і тую ж манету.

У цяперашні час у фондах Ваўкавыскага ваенна-гістарычнага музея імя П.І. Баграціёна захоўваецца адзін пражскі грош, знойдзены Г.І. Пехам падчас археалагічных даследаванняў на «Шведскай гары» ў Ваўкавыску ў 1947 г. (**Мал. 1**). У кнізе паступленняў (запіс КП 1140, зроблены 13 чэрвеня 1950 г.) манета зарэгістраваная як «*Грош Пражскі Венцаслава II. 1300–1305 гг.*». Вага манеты 2.84 г. Іншыя пражскія грошы ў збор музея не паступалі (паведамленне галоўнага захавальніка фондаў музея В.М. Суета).



**Мал. 1.** Пражскі грош са збору Ваўкавыскага ваенна-гістарычнага музея

Вывучэнне здымкаў музейнага экзэмпляра паказала, што манета насамрэч з'яўляецца значна пацёртым і карадаваным пражскім грошам Вацлава IV (1378–1419). На аверсе часткова чытаецца імя караля: [+WENCEZL]AVS : [T]ERCIV[S]. Па класіфікацыі І. Ганы грош можа адпавядаць тыпу V.a (перыяд чаканкі 1384–1395 гг.) (*Hána J.*, 2003. S. 59). Як бачым, падчас раскопак на «Шведскай гары» ў Ваўкавыску быў знойдзены толькі адзін пражскі грош Вацлава IV, які атрымаў першапачатковую памылковую атрыбуцыю. Даныя пра знаходку гроша Вацлава II у Ваўкавыску не пацвярджаюцца.

Звесткі пра больш раннія знаходкі грошаў Вацлава II недакладныя і носяць меркаваны характар. У Гродне каля Каложы (паміж 1928 і 1930 гг.) знойдзены пражскі грош «*імаверна, Вацлава II*» (*Jodkowski J.*, 1933. S. 127; *Рябцевич В.Н.*, 1965. С. 131, № 21).

Каля вёскі Апанаўцы Лідскага павета (цяпер Воранаўскі раён Гродзенскай вобласці) «*часта знаходзілі грошы Вацлава IV, часам – Яна Люксембургскага і Карла IV, рэдка – Вацлава II*» (*Gutowski M.*, 1921. S. 79; *Рябцевич В.Н.*, 1965. С. 131, № 24). Пры археалагічных даследаваннях балцкага могільніка ў ваколіцах вёскі Апанаўцы ў канцы XIX ст. сапраўды былі выяўлены пражскія грошы Вацлава IV, літоўскія дэнарыі і майсенскі грош Вільгельма I (*Рябцевич В.Н.*, 1965. С. 131, № 23; *Рябцевич В.Н.*, 2004. С. 62, № 71–73; *Кватковская А.В.*, 1998. С. 135). Дакладныя звесткі аб знаходках пражскіх грошаў Вацлава II адсутнічаюць.

Найбольш ранім сведчаннем паступлення пражскага гроша на рускія землі лічыцца скарб, знойдзены ў Смаленску ў 1889 г. Пры ўладкаванні будынка гарадскога вадаправода на беразе Дняпра знойдзены гліняны гаршчок, у якім знаходзілася вялікая колькасць манет і тры срэбных зліткі (*Иозефович А.*, 1889.

**Фототаблиця 1.** Монети Зіньківського комплексу



*1*



*2*



*3*



*4*



*5*



*6*



*7*



*8*



*9*



*10*



*11*



*12*



**Рис. 3.** Графічна реконструкція відбитків штемпелів данга хана Пулада, виконана С. Бурковським

На аверсі цієї монети розміщена легенда پولاد/خان – «Пулад хан».

Данг з Богодухівського комплексу, репродукований на **Рис. 1.4**, має іншу легенду аверсу.

На **Рис. 4** відтворено дві одноштемпельні з ним монети.



**4.1.** 1.05 г

**4.2.** 1.13 г

**Рис. 4.** Фотозображення дангів хана Пулада, одно штемпельних монеті з Богодухівського комплексу

Легенда на лицьовій стороні цих монет має такий вигляд:

العادل/پولاد/خان

«Справедливий Пулад хан».

У науковій літературі монетний тип дангу, відтвореного на **Рис. 1.4**, автором не виявлено. Графічні реконструкції відбитків штемпелів цієї монети, виконані спеціально для цієї статті В. Тішкіним, наведено на **Рис. 5**.



**Рис. 5.** Графічна реконструкція відбитків штемпелів дангів хана Пулада без позначення місця випуску та зі спотвореною датою карбування на реверсі




























*Навуковае выданне*

**Русь, Літва, Арда**
**ў помніках нумізматыкі і сфрагістыкі**
Зборнік навуковых артыкулаў

*Заснаваны ў 2015 г.*
*Том 14. Спецвыпуск «Заходняя Русь і Арда»*

Падпісана ў друк 04.01.2024
Фармат 60×90/8.
Гарнітура «Міньён».
26 друк. л. Бумага мелаваная.
Тыраж 100 экз.

http://ruslitvaorda.ru